## Новыя абрады — у жыццё

# СВЯТА ВЁСКІ

У адзінаццаць гадзін дня ля абеліска загінуўшым воінам-аднавяскоўцам, што ў скверы ля сельскага клуба ў Баханах, пачаўся ўрачысты мітынг. На яго сабраліся ветэраны вайны і працы, камсамольцы трыццатых гадоў, былыя кіраўнікі калгаса, механізатары і жывёлаводы, спецыялісты сельскай гаспадаркі, моладзь.

У ганаровай варце перад абеліскам выстраіліся ветэраны вайны. На грудзях кожнага баявыя і працоўныя ўзнагароды.

Выступае ветэран вайны, сяржант Іван Дзям'янавіч Зубачоў. Ён расказвае прысутным аб тых цяжкіх днях, якія прыходзілася перажываць ў перыяд вайны савецкаму народу і нашым аднавяскоўцам, аб сваіх франтавых дарогах.

Былая партызанская сувязная, настаўніца мясцовай школы, пенсіянерка Серафіма Васільеўна Максіменка расказала аб камсамольскіх буднях даваенных гадоў. Пра тое, якую яны аказвалі дапамогу партызанам у барацьбе за вызваленне сваёй Айчыны ад фашысцкай навалы, які ўдзел прымалі ў аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі.

Затым навучэнцы мясцовай сярэдняй школы ўскладваюць да абеліска вянкі і букеты жывых кветак.

Ветэран вайны, былы настаўнік мясцовай школы, пенсіянер Спірыдон Дзянісавіч Лаўрыненка расказаў аб гісторыі вёскі, аб яе заслужаных людзях, аб іх барацьбе за ўстанаўленне Савецкай улады, аб удзеле ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі і развіцці калгаснай вытворчасці ў даваенныя і пасляваенныя гады. Многія выпускнікі мясцовай школы, гаварыў ён, сталі афіцэрамі Савецкай Арміі, маюць вучоную ступень і з'яўляюцца выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, працуюць у сельскай гаспадарцы. Гэта Пётр Андрэевіч Андрэйкаў, Васіль Яфімавіч Рабцаў, Т. А. Зубачоў, І. А. Антоненка, В. Д. Антоненка і многія другія.

Ветэран вайны і працы Агафон Андросавіч Кастроў спыніўся на тых падзеях, якія адбываліся ў вёсцы ў першыя пасляваенныя гады, калі быў старшынёй праўлення калгаса «Чырвоны маяк». Нялёгкім быў час, гаварыў ён, не хапала рабочых рук, тэхнікі, цяжка было з насеннем, марудна развівалася жывёлагадоўля. Нягледзячы на гэта, мы пераадолелі цяжкасці і выйшлі на шырокую прастору.

Тут жа на свяце вёскі намеснік ваеннага камісара раёна М. К. Рубцоў уручыў ветэранам ордэны Вялікай Айчыннай вайны II ступені.

Людзям, якімі зараз ганарацца аднавяскоўцы, прысвяціла свой расказ старшыня Баханоўскага сельскага Савета народных дэпутатаў Валянціна Уладзіміраўна Гранкоўская. Яна спынілася на сям'і Івана Ігнатавіча і Афанассі Пракопаўны Міхаленкі. Два іх сыны — Віктар і Васіль — механізатары. Віктар працуе ў калгасе на энерганасычаным трактары Т-150, а яго бацька — на МТЗ-80. За паспяховае выкананне заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў адзінаццатай пяцігодкі Іван Ігнатавіч узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Па прыкладу бацькі працуюць дзеці. Васіль — шафёрам, малодшая дачка Надзея — заатэхнікам у родным калгасе.

І. І. Міхаленка расказаў аб сваім працоўным шляху, аб тым, як асабіста ён змагаецца за ажыццяўленне Харчовай праграмы.

Самыя маленькія жыхары вёскі — выхаванцы дзіцячага садзіка падрыхтавалі для дарослых свой канцэрт. З замілаваннем слухалі бацькі, дзядулі і бабулі вершы і песні ў іх выкананні. А калектыў мастацкай самадзейнасці мясцовай школы таксама падрыхтаваў цікавую канцэртную праграму. Асабліва спадабаліся ўсім песня «Зямлянка» ў выкананні дзесяцікласніцы Алены Краўцовай, «Адзінокая гармонь», якую спявала Таня Горлава. Надзея Балдуева пакарыла слухачоў майстэрствам чытальніцы. У цікавых гульнях, масавых танцах, карагодах удзельнічалі нават пажылыя. Лепшым уручаліся прызы.

Тут жа ў скверы працаваў буфет, дэманстраваліся вырабы мясцовых умельцаў.

Масавае гулянне працягвалася да позняга вечара.

**І. БАРЫСЕНКА.**

**Барысенка, І.** Свята вёскі / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка. — 1986. — 25 лістапада. — С. 3.

*Урачысты мітынг у в. Баханы.*